Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Магілёўскую журналістку Дар’ю Чульцову будуць судзіць

23.03.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова




Дар'я Чульцова. Фота: mspring.online.

**Як паведамляе БАЖ, магілёўскую журналістку Дар’ю Чульцову збіраюцца прыцягнуць да адказнасці паводле ч. 2 арт.22.9 КаАП — нібыта за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ.**

19 сакавіка супрацоўнікі міліцыі спынілі журналістку ў дварэ каля дома, дзе яна жыве, і ўручылі позву з патрабаваннем з’явіцца ў Кастрычніцкі РАУС Магілёва 20 сакавіка.

Сёння Дар’я Чульцова наведала РАУС, і старшы ўчастковы інспектар **Аляксандр Волкаў** склаў на яе пратакол аб парушэнні заканадаўства аб СМІ. Як і меркавала журналістка, падставай для адміністрацыйнага пераследу стаў яе ўдзел у асвятленні акцыі супраць павышэння коштаў на бензін, якая праходзіла 8 лютага каля гіпермаркета “Е-сіці” ў Магілёве.

Міліцыянт таксама уручыў Чульцовай позву з патрабаваннем з’явіцца ў суд Кастрычніцкага раёна Магілёва 24 сакавіка ў 10.30 раніцы. На гэты час запланаваны разгляд яе адміністрацыйнай справы.


27 сакавіка ў судзе Кастрычніцкага раёна Магілёва павінен адбыцца разгляд справы журналіста **Міхаіла Аршынскага**. Адміністрацыйны пратакол на яго склалі за відэаздымку ўсе той жа акцыі пратэсту супраць падвышэння коштаў на бензін.

Праваабаронца "Вясны" з Магілёва **Барыс Бухель** параіў журналістам звярнуцца ў Кастрычніцкі райсуд з хадайніцтвам, каб іх справы аб'ядналі і даручылі разглядаць аднаму суддзі. Ці адрэагуе суд на просьбу журналістаў, пакуль не зразумела.

Нагадаем, што сёння суд Ленінскага раёна Магілёва пакараў штрафамі ў памеры 50 базавых велічынь фрылансераў **Аліну Скрабунову** і **Аляксандра Сідарэўскага**. Крыху раней за працу без акрэдытацыі іх аштрафаваў Кастрычніцкі райсуд Магілёва. Ва ўсіх выпадках журналістам ставілася ў віну парушэнне ч. 2 арт.22.9 КаАП Рэспублікі Беларусь.

Твитнуть




Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"









## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў


Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны


Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"














## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY